*УДК 398.2(=161.3):37.013.8*

# ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ МІФАЎ, ПАДАННЯЎ І ПАВЕР'ЯЎ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

***А. Л. Міхайлава***

*Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, пр. Маскоўскі, 33, 210038, г. Віцебск, Беларусь,elena-mikhaylova@rambler.ru*

Артыкул прысвечаны праблеме даследавання выхаваўчых магчымасцей такіх традыцыйных сродкаў беларускага народа, як міфы, паданні і павер'і. Яны разглядаюцца не толькі са зместавага пункту гледжання і сакральна-сэнсавага напаўнення, але і ўздзеяння магічных істот, прадметаў і абставін на жыццядзейнасць, стасункі асобы, сям'і, на выхаванне дзяцей. Даследаванні этнаграфічнага (М. Я. Нікіфароўскі, А. К. Сержпутоўскі) і этнапедагагічнага (А. Я. Багдановіч) зместу народных міфаў, паданняў і прыкмет мелі шырокае распаўсюджванне ў Беларусі яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Выхаваўчы патэнцыял дадзеных сродкаў народнай педагогікі магчыма паспяхова выкарыстоўваць у сямейным выхаванні, прывучаючы дзяцей да акуратнасці, абачлівасці, стараннасці.

***Ключавыя словы:*** міфы; народная педагогіка; павер'і; паданні; сродак народнай педагогікі.

# EDUCATIONAL POTENTIAL OF BELARUSIAN FOLK MYTHS, LEGENDS AND BELIEFS: HISTORY AND PRESENT

***A. L. Mikhaylova***

*Vitebsk State University named after P.M. Masherov, Moscow Ave., 33, 210038, Vitebsk, Belarus, elena-mikhaylova @ rambler.ru*

The article is devoted to the problem of researching the educational possibilities of such traditional means of the Belarusian people as myths, legends and beliefs. They are considered not only from the content point of view and sacred and semantic content, but also the impact of magical beings, objects and circumstances on life, relationships of the individual, family, and the upbringing of children. Studies of the ethnographic (M. Ya. Nikiforovsky, A. K. Serzhputovsky) and ethnopedagogical (A. Ya. Bogdanovich) content of folk myths, myths and signs were widespread in Belarus at the end of the 1st century. The educational potential of these tools of folk pedagogy can be successfully used in family education, teaching children to neatness, prudence, diligence.

***Keywords:*** myths; folk pedagogy; beliefs; legends; means of folk pedagogy.

Беларускія народныя міфы (апавяданні, якія перадаюць ўяўленні людзей аб свеце, месцы чалавека ў ім, аб паходжанні ўсяго існага, аб багах і героях і якія прадугледжваюць прыярытэт рэжыму адначасовасці

ўспрымання і мыслення) і паданні (жанр неказачнага празаічнага фальклору, што распавядае пра дзеянні галоўных герояў, раскрывае іх рысы характару, выяўляе грамадскія і асабістыя каштоўнасці, якія, на думку апавядальніка і слухачоў, мелі месца ў гісторыі чалавецтва) прыйшлі да нас з далёкай мінуўшчыны, яны ўключаюць рэшткі паганскіх вераванняў усходніх славян. Шмат вякоў таму нашы продкі не маглі растлумачыць з’явы прыроды, розныя стыхіі, таму пачалі замацоўваць іх за дзеяннямі багоў, якіх неабходна было задобрыць і паднашэннем, і справай, каб папярэдзіць разгулы прыроднай стыхіі. Багі падзяляліся на станоўчых і адмоўных, яны лічыліся такімі з-за тых якасцей, якімі валодалі.

Тады як станоўчага бажаства (да іх ліку можна аднесці Белуна, Дамавіка, Талаку, Сыценя, Дзявою і інш.) можна было не баяцца, трэба было толькі не ўводзіць яго ў гнеў, выконваючы ўсё, як трэба, з адмоўным (Вадзянік, Ваўкалак, Ліхаманка, Мара, Халера і іншыя) лепш было зусім «не мець справы», бо іх рэакцыяй на сустрэчу з чалавекам была ці хвароба апошняга, ці страта маёмасці або яе часткі, ці, наогул, смерць чалавека.

Шэраг станоўчых багоў непасрэдна спрыяў працавітасці і гаспадарлівасці чалавека. Напрыклад, Бялун – галоўны бог, бацька неба – добры і творыць усім дабро, з’яўляецца своеасаблівым заступнікам жней, нават дапамагае іх рабоце [1, с. 9]; Дамавік – «чалавекападобная істота», якая жыве побач з чалавекам і, такім чынам, уважліва сочыць, каб ён добра вёў гаспадарку, каб усе рэчы былі на сваім месцы, каб у хаце быў спакой і згода, у адваротным выпадку ён перашкаджае свайму гаспадару, знарок знішчаючы гаспадарку [2, с. 254]; Сыцень – бог восені – клапоціцца пра парадак на палях і ў агародах, калі гаспадар – ашчадны чалавек (збірае ўвесь вырашчаны ўраджай, пакідаючы агарод ці поле чыстым), бажаство дарue яму на будучы год добры ўраджай [1, с. 36–37].

Некаторыя адмоўныя багі «прымушалі» людзей жыць па-хрысціянску: у дабрыні і сумленнасці. Напрыклад, калі чалавек быў пры жыцці помслівым, жорсткім, зайздрослівым, ён станавіўся Вупырам – пачварай, якая праследуе сваіх «крыўдзіцеляў» і смокча ў іх кроў [2, с. 255]. Мара ці Марна падчас сну чалавека нападае на яго і душыць, але праследуе яна не ўсіх людзей, а толькі тых, хто ўчыніў якое-небудзь злачынства або жыве несумленна [2, с. 256–258]. Ёсць і станоўчая істота, якая прымушае чалавека быць добрым і з павагай адносіцца да іншых людзей, – гэта Дабрахочы («імя» бога складаецца са слоў «дабро» і «хацець»). Гэтая істота карае людзей залішне гордых, непачцівых,

насылаючы на іх хваробы, якія часам прыводзяць за сабой смерць [1, с. 23–24].

Дзявоя – багіня цнатлівасці – апякае дзяўчыну, пакуль тая не выйдзе замуж. Апека гэтай багіні лічыцца за вышэйшую ўзнагароду, гэты факт сведчыць аб значнасці дзявочай чысціні для беларускага народа [1, с. 33].

Міфы беларусаў сведчаць аб значнасці фізічнага здароўя для народа, якое непасрэдна залежыць ад чыстай, якасна прыгатаванай стравы (трэба сказаць, што, на жаль, наш народ аб гэтым не вельмі клапаціўся), у адваротным выпадку немінуемы «прыход» у дадзеную сям'ю Ліхаманкі альбо Халеры [2, с. 289].

Такім чынам, беларускія народныя міфы і паданні не толькі распавядаюць аб значнасці ідэальных рыс характару: працавітасці і ашчаднасці, дабрыні і павагі да людзей, сумленнасці, – але і прымушаюць чалавека ў жыцці кіравацца імі, інакш яго чакае кара.

Прыкметы і павер'і (гэта перакананні, што ідуць з даўніны, звычайна заснаваны на забабонных уяўленнях, якія рэгламентуюць грамадскія паводзіны і жыццядзейнасць людзей пэўнай мясцовасці) яшчэ ў канцы XIX стагоддзя мелі шырокае распаўсюджванне на Беларусі. Строгае выкананне і абмен імі былі звычайнай справай беларусаў, неабходнай умовай іх спакойнага існавання, аб чым красамоўна сведчыць народная прыказка: *«Без прыкмет ходу нет»*. Прыкметы і павер'і, на думку М. Я. Нікіфароўскага, змяшчаюць у сабе прытчавае павучанне, перадачу ўласнага або чужога назірання. Больш таго, дадзены народна-педагагічны сродак утрымлівае ідэі і «рэцэпты», якія фарміруюць маральна і фізічна здаровую асобу [3, с. 15]. Напрыклад, беларусы шчыра верылі, што калі назваць дзіця імем славутага або высокамаральнага чалавека, то малому перададуцца яго добрыя якасці; каб члены сям'і, маёмасць, хатняя жывёла былі на добрым нaглядзе, нельга было ўводзіць у гнеў «вартаўніка» гаспадаркі – Дамавіка, для гэтага трэба падтрымліваць лад і спакой у сям'і, быць ашчадным і клапатлівым гаспадаром. Неабходна быць пачцівым з іншымі, не паводзіць сябе залішне горда, жыць сумленна – толькі тады можна пазбегнуць розных хвароб, якія, згодна павер'ю, насылае Дабрахочы, Ліхаманка ці Марна.

Існавала шмат павер'яў, якія рэгламентавалі паводзіны цяжарнай жанчыны і былі закліканы аказаць дабратворны ўплыў на здароўе, выгляд, характар і лёс будучага дзіцяці: нельга было глядзець на пажар, а калі такое здаралася, нельга было, спалохаўшыся, дакранацца рукамі да свайго цела (у дзіцяці ў адпаведным месцы будзе вогненная пляма); нельга было біць і штурхаць нагамі хатніх жывёл (на свет з'явіцца вырадак); нельга шмат есці (плод вырасце вельмі вялікім, і дзіця ўвесь час

будзе хацець есці), але бытавала перакананне, што цяжарная жанчына павінна есці ўсё, калі ёсць апетыт, каб будучае дзіця з'явілася на свет фізічна здаровым; нельга маніць, красці, лаяцца, зайздросціць іншым людзям (дзіця вырасце манюкай, злодзеем, грубіянам, зайздроснікам) [3].

Цяжарная жанчына і яе сям'я прытрымлівалася шэрагу няпісаных прыкмет і павер'яў, якія забяспечвалі дабратворны ўплыў на здароўе, выгляд і характар дзіцяці ў чэраве маці і пры нараджэнні, а жанчыне «гарантавалі» нескладаныя роды, што паказвае клопат маці пра стан фізічнага і маральнага здароўя свайго будучага дзіцяці [4, с. 24]. Многія са звычаяў і абрадаў мелі рацыянальнае зерне, іх значнасць пацвярджаецца нават сучаснай медыцынскай навукай. Больш таго, сучасныя жанчыны, выношваючы дзіця, прытрымліваюцца гэтых жа правілаў (узгодненых з павер'ямі), што ўзніклі і замацаваліся ў быце беларусаў стагоддзі таму, напрыклад:

1) нельга было падымаць і насіць цяжарнай вялікія грузы, сцягваць моцна спадніцу, шмат есці (плод вырасце вельмі вялікім і дзіця ніколі не будзе сытым), але будучая маці павінна была есці ўсё, калі на тое быў апетыт, каб дзіця з'явілася на свет здаровенькім;

2) у час працы неабходна было падвязваць жывот ручніком або хусткай (зараз для гэтай мэты прызначаны бандаж), асцерагацца ўдараў у жывот, больш рухацца, быць на свежым паветры, а менш спаць. Некаторыя забароны былі звязаны з нейкай непрадказальнай, магічнай сілай, напрыклад, у выпадку перапуду цяжарнай, якая глядзела на пажар, дзіця магло нарадзіцца з чырвонай (вогненнай) плямай у тым месцы, да якога на ўласным целе дакранулася будучая маці.

Таксама цяжарнай жанчыне забаранялася прысутнічаць на пахаванні, каб дзіця не захварэла якой-небудзь цяжкай хваробай або не «атрымала» жоўты хваравіты колер твару. На самой справе, сучаснай медыцынскай і псіхалагічнай навукамі даказаны той факт, што моцныя эмоцыі, перажываныя маці праз яе гармоны перадаюцца будучаму дзіцяці, «прымушаючы» апошняга моцна хвалявацца – менавіта таму ў плода прылівае кроў да месца дакранання, становячыся тромбам, які можа рассмактацца з цягам часу, а можа і застацца з чалавекам на ўсё яго жыццё, або змяняецца колер твару падчас захворвання малога з-за сапраўды моцнага «перажывання».

Некаторыя радзінныя звычаі і абрады былі звязаны з бескарыснымі прымхамі і забабонамі беларускага народа, але цяжарная жанчына, верачы ў іх, імкнулася строга выконваць дадзеныя «прадпісанні паганскіх вераванняў» (напрыклад, не пераступаць праз сякеру, каб у дзіцяці не было пры нараджэнні рассечанай, «заечай» губы; не тушыць галавешку,

што выграбла з печы, каб у дзіцяці не было працяглай хваробы страўніка, і інш.) [5, с. 47]. Але ў час цяжарнасці жонкі рэгламентаваліся і паводзіны мужа, што, па меркаванні народа, забяспечвала паспяховы зыход родаў і нараджэнне здаровага дзіцяці. Мужчыне забаранялася нецэнзурна размаўляць, разбураць птушыныя гнёзды, каб дзіця нарадзілася жывым, а жонка добра адчувала сябе пасля родаў і хутчэй папраўілася, ды і такія павер'і рыхтавалі мужчыну да ролі бацькі – узору фізічна і маральна здаровай асобы для сваіх дзяцей.

Шматлікія гаспадарчыя дзеянні людзей былі строга падпарадкаваны пэўным прыкметам, якія могуць забяспечыць гаспадару лад і дабрабыт, добры ўраджай, здароўе сям'і і хатняй жывёлы. Адным з такіх прыкладаў з'яўляецца абрад заворвання альбо першай баразны (належыць да разнавіднасці земляробчых, звязаны з пачаткам веснавых палявых работ). Заворванне прыходзілася на канец красавіка – пачатак мая і прымяркоўвалася да народнага календара, згодна са шматлікімі феналагічнымі прыкметамі: цвіценнем пэўных раслін, прылётам з выраю птушак, станам глебы, надвор'я і інш. [6, с. 38]. Першы выхад у поле быў святам і суправаджаўся комплексам сімвалічна значымых абрадавых дзеянняў, звычаяў, павер'яў. Араты ўставаў на золку, прыбіраўся ў чыстае святочнае адзенне і адпраўляўся з сахою ў поле. Ён абавязкова павінен быў прынесці з сабой рытуальны хлеб і ваду (своеасаблівыя абярэгі супраць нежаданых сустрэч і дурнога вока), якія павінны былі перадаць узноўленым палеткам сваю жыццёвую сілу, каб увосень гаспадар атрымаў добры ўраджай. Часта разам з вадой і хлебам бралі з сабой соль, велікодныя яйкі, мяса, якія трэба было з'есці на мяжы поля, а косці і шкарлупінне тут жа закапаць (дадзеныя магічныя дзеянні спрыялі добраму ўраджаю). Абрадавыя дзеянні ў гэты дзень не міналі і хатнюю жывёлу – коней або валоў. Іх акраплялі крынічнай вадой перад выхадам у поле, каб жывёла была моцнай і вынослівай на працягу ўсяго сельскагаспадарчага цыкла, або качалі на спіне каня курынае яйка, прыгаворваючы: «Будзь мой конь гладак і повін, як яйцо». Гаспадар у гэты дзень нядоўга працаваў, бо дома яго чакаў святочна накрыты стол і сям'я, з якой ён павінен адзначыць свята. У цэнтры стала абавязкова прысутнічала абрадавае печыва ў выглядзе сахі, сярпа і іншых сельскагаспадарчых прылад, што павінна было надаць фізічнай моцы гаспадару і яго сям'і, каб даглядаць зямлю і будучы ўраджай.

Такім чынам, большасць міфаў, паданняў і павер'яў служылі ў якасці перасцярогі дарослым і дзецям ад негатыўных наступстваў акаляючай рэчаіснасці. Дарослыя, пакідаючы сваіх дзяцей сам-насам, былі ўпэўнены, што яны не будуць рабіць рызыкоўныя рэчы, паколькі і

дом, і двор ахоўваецца «чароўнымі істотамі», такімі як Дамавік, Гуменнік, Дабрахочы. Нават «адмоўныя істоты», якія маглі насылаць хваробу, бедства, нават смерць, таксама ўтрымлівалі людзей ад рызыкоўных учынкаў: Мары або Марны можна пазбегнуць толькі праз добрыя ўчынкі ў адносінах да іншых людзей. Міфы і паданні адразу былі напоўнены павучальным зместам – яны раскрывалі не толькі наступствы няправільных дзеянняў, але і ўтрымлівалі ў сабе рэкамендацыі, як можна было пазбегнуць негатыўных праяў і цяжкасцей. Дадзены сродак народнай педагогікі бабулі і дзядулі часта выкарыстоўвалі пры выхаванні сваіх унукаў рознага ўзросту. Народныя павер'і дапамагалі людзям прытрымлівацца пэўных правіл і канонаў, устаноўленых грамадствам, каб захаваць сябе, сваю сям'ю, сваё здароўе, дабрабыт і лад у сям'і, а таксама пэўным чынам спрыялі выхаванню і дарослых людзей, і дзяцей.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Міфы Бацькаўшчыны / Беларус. энцыкл. / уклад. У. А. Васілевіч. Мінск : БелЭн, 1994.
2. *Сержпутоўскі А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мінск : Універсітэцкае, 1998.
3. *Никифоровский Н. Я.* Очерки Витебской Белоруссии // Этнографическое обозрение. 1897. № 3.
4. *Кухаронак Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : Канец ХІХ-ХХ ст.ст. Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
5. *Богданович А. Е.* Пережитки древняго міросозерцанія у белоруссовъ : Этнографическій очеркъ. Мінск : Беларусь, 1995.
6. Земляробчы каляндар : абрады і звычаі / Уклад. А. І. Гурскі. Мінск : Беларуская навука, 1995.